**ЗНАЙСЦІ СВАЁ МЕСЦА Ў НАВУЦЫ**
Адораная моладзь нашага ўніверсітэта
Стар. 2

**МОСТ ПАМІЖ КУЛЬТУРАМІ**
Як у БДУ вучацца
і знаходзяць сябе студэнты з-за мяжы
Стар. 3

**СТРАТЭГІЧНЫЯ МЭТЫ НА НАСТУПНУЮ ПЯЦІГОДКУ**
І задачы на 2025/2026 навучальны год
Стар. 4-5

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

23 верасня 2025 года, №9 (2300)

# ВЕКТАР НА ЯКАСЦЬ, КАМПЕТЭНЦЫІ БУДУЧЫНІ І НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ: У БДУ ПРАДСТАВІЛІ СТРАТЭГІЮ РАЗВІЦЦЯ НА ПЯЦЬ ГАДОЎ

**Абмеркаванне праекта стратэгіі развіцця адбылося 8 верасня на савеце ВНУ з удзелам кіраўніцтва факультэтаў і інстытутаў, дырэктараў прадпрыемстваў, кафедраў, начальнікаў галоўных упраўленняў і ўпраўленняў, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і студэнтаў БДУ.**



З дакладам на заяўленую тэму выступіў рэктар БДУ **Андрэй Кароль**. У аснову прапанаванай стратэгіі пакладзены вынікі выканання мэт БДУ за 2021–2025 гады, сучасныя тэндэнцыі навукова-тэхнічнага развіцця, нацыянальныя сацыяльна-эканамічныя прыярытэты. Галоўны акцэнт у стратэгіі зроблены на павышэнні якасці працы па шасці напрамках з улікам падрыхтоўкі высокапрафесійных спецыялістаў і развіцця БДУ.

– Ёсць вялікі запыт ад замоўцаў кадраў на асобу, якая нестандартна думае, а не экіпіраваная інфармацыяй. Таму важная адукацыя, якая дазваляе студэнту самарэалізавацца за кошт індывідуалізацыі і выбудоўвання ўласнай адукацыйнай траекторыі, – растлумачыў рэктар канцэптуальнасць прадстаўленых мэт.

З улікам гэтага плануецца забеспячэнне гнуткасці і варыятыўнасці адукацыйных праграм; стварэнне ўмоў для развіцця патэнцыялу асобы і фарміравання ў яе кампетэнцый будучыні з выкарыстаннем сучасных падыходаў у навучанні; удасканаленне лічбавага асяроддзя і інтэграцыя штучнага інтэлекту ў адукацыйны працэс; рэалізацыя эфектыўнай сістэмы ўзаемадзеяння з замоўцамі кадраў.

Навуковы вектар, як адзначыў Андрэй Кароль, узмоцняць праз інтэграцыю з рэальным сектарам эканомікі і павышэнне долі міждысцыплінарных даследаванняў, а кадравы – шляхам стварэння спрыяльнага асяроддзя для прафесійнай самарэалізацыі і доўгатэрміновай уцягнутасці работнікаў, павышэння прэстыжу ўніверсітэта на рынку працы.

Ідэалагічная і выхаваўчая работа працягнецца ў адпаведнасці з Асновамі ідэалогіі беларускай дзяржавы. Акцэнт зробяць на захаванасці і прасоўванні нацыянальных каштоўнасцяў, сацыяльнай падтрымцы, духоўна-маральным выхаванні асобы. Інтэрнацыяналізацыю і экспартны патэнцыял БДУ плануецца павялічыць пры дапамозе шматвектарнага і ўзаемавыгаднага партнёрства, адкрыцця новых сумесных адукацыйных праграм, працы з новымі перспектыўнымі рэгіёнамі. Таксама працягнецца палітыка па ўмацаванні ўстойлівай эканамічнай мадэлі БДУ праз рэалізацыю экспартнага патэнцыялу, развіццё платных адукацыйных паслуг. Стратэгія таксама ўключае ў сябе стварэнне новых элементаў інфраструктуры ўніверсітэта, рэалізацыю праектаў «Вышэйшая школа біятэхналогій» і «Вышэйшая школа прыродазнаўчых навук і тэхналогій».

З улікам новых выклікаў часу таксама была прадстаўлена сёмая новая стратэгічная мэта, накіраваная на абарону інфармацыйных сістэм. Са слоў рэктара, яна прадыктавана нашай рэальнасцю і важнасцю забеспячэння бяспекі ў інтэрнэт-прасторы.

– Мэта сугучная з развіццём сістэмы штучнага інтэлекту і яго ўкараненнем ў адукацыю. Сёння тэхналогіі маніпулявання свядомасцю пастаўлены на вельмі высокі ўзровень, і важна быць гатовым да процідзеяння гэтым выклікам, – растлумачыў рэктар.

Прадстаўленая стратэгія ўключае ў сябе канкрэтныя мэты і задачы па яе рэалізацыі, якія дазволяць умацаваць дасягненні БДУ і працягнуць эфектыўнае развіццё. Андрэй Кароль таксама нагадаў пра асноўныя вынікі дзейнасці ВНУ за апошнія гады, галоўным з якіх стала атрыманне **Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці.** Высокая ўзнагарода, як падкрэсліў рэктар, стала пацвярджэннем эфектыўнасці ўсебаковай працы работнікаў БДУ.

– Універсітэт паспяхова рэалізуе сваю місію «Быць заўсёды першым». За гэтым стаіць вялікая адказнасць, – распавёў рэктар. – Мы дасягнулі высокіх вынікаў у адукацыйнай, навуковай, міжнароднай дзейнасці, развілі нашу інфраструктуру, многае зрабілі для ўмацавання духоўна-маральных каштоўнасцяў моладзі. На працягу апошніх гадоў правялі **мадэрнізацыю структуры спецыяльнасцяў, аптымізавалі даходы і выдаткі.** Заробленыя грошы дазволілі **інвеставаць у матэрыяльна-тэхнічную базу і кадравы патэнцыял.**

Дарэчы, у БДУ за апошнія гады **адкрыта 25 новых спецыяльнасцяў, з якіх 23 унікальныя,** эфектыўна рэалізавана **сістэма эўрыстычнага навучання,** укаранёныя інавацыйныя падыходы ў навучанне. Упершыню экспарт навукаёмістых тавараў і паслуг за апошнія 10 гадоў **перасягнуў мяжу ў 4 млн долараў. Кожная 3-я доктарская і 4-я кандыдацкая дысертацыі** абараняюцца супрацоўнікамі ўніверсітэта, **кожны пяты** уладальнік стыпендыі аспірантам фонду Прэзідэнта Рэспублікі Бела-



УНІВЕРСІТЭТ
23 верасня 2025 года, №9 (2300)



русь вучыцца ў нашым універсітэце. Таксама адзначаецца **рост на 60,6%** колькасці замежных аспірантаў. БДУ стабільна захоўвае лідарства ў Беларусі па публікацыйнай актыўнасці і цытаванні навукоўцаў паводле даных РІНЦ. Акрамя таго, на БДУ даводзіцца **19%** цытаванняў прац беларускіх навукоўцаў сярод усіх навуковых і адукацыйных арганізацый Беларусі, што пацвярджае лідарства ўніверсітэта. Сярод айчынных ВНУ доля БДУ складае **25,5%.** У БДУ пачалі ствараць **унікальную прадукцыю:** нанаспадарожнікі, лекавыя прэпараты. За апошнія пяць гадоў універсітэт чатырохразова станавіўся **найлепшым экспарцёрам года.**

У БДУ ўкаранёная **сістэма настаўніцтва.** Адным з паказальных вынікаў ідэалагічна-выхаваўчага напрамку пазначаны **рост уцягнутасці студэнтаў** у дзейнасць моладзевых арганізацый, **прымяненне інавацыйных формаў праектнай дзейнасці, актыўны ўдзел студэнтаў** у падзеях рэспубліканскага і міжнароднага маштабу. За апошнія гады **заработная плата выкладчыкаў вырасла** амаль у два разы. Уводзяцца ў эксплуатацыю **абноўленыя** навучальныя карпусы, **мадэрнізаваны** корпус гістарычнага факультэта-музея. Хуткім часам **завяршаецца ўзвядзенне** фізкультурна-аздараўленчага комплексу на вул. Курчатава, **пачаты капітальны рамонт** трэцяй і чацвёртай чэргаў галоўнага корпуса. Актыўна **ідзе будаўніцтва** новага навучальна-лабараторнага корпуса.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# ЗНАЙСЦІ СВАЁ МЕСЦА Ў НАВУЦЫ



**«Гісторык павінен умець разгаварыць крыніцу», – кажа Марат Крупко. Сам ён робіць шмат, каб авалодаць такім сапраўды складаным майстэрствам: няхай гэта будзе царкоўнае начынне XVI стагоддзя ці ўспаміны ўдзельніка Карэйскай вайны. Які сакрэт? Студэнт верыць, што нават самы несамавіты артэфакт можа распавесці гісторыю – калі задаць яму правільныя пытанні.**

Студэнт гістарычнага факультэта **Марат Крупко** пра ўключэнне ў банк адоранай моладзі даведаўся на трэцім курсе. За час навучання ён напісаў больш за дзясятак навуковых прац, многія з якіх ужо апублікаваныя. Менавіта гэта і стала асноўнай прычынай узнагароджання маладога чалавека.

Марат актыўна займаецца даследчай дзейнасцю. У працах хлопца намеціліся дзве магістральныя лініі. Першая сфера інтарэсаў звязана з рэканструкцыяй нюансаў прыходскага жыцця на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. У той час прыход быў найважнейшым сацыякультурным цэнтрам у вёсцы ці горадзе. Разам з тым пытанні паўсядзённага функцыянавання цэркваў, служэння і побыту радавых святароў, практычна не даследаваны. Студэнт ужо напісаў артыкулы, якія тычацца развіцця царкоўнай іерархіі, набажэнскай літаратуры, матэрыяльнай культуры прыходаў. Але, як адзначае малады навуковец, ён толькі трохі прапліў святло на працэсы і з'явы, з якімі сутыкаліся нашы продкі пяць стагоддзяў таму.

Другая лінія даследаванняў звязана з вывучэннем вуснай гісторыі, у якую ўваходзяць апавяданні сучаснікаў, відавочцаў і ўдзельнікаў гістарычных падзей XX стагоддзя. Марату Крупко ўдалося запісаць інтэрв'ю з вязнем Савецкага ГУЛАГа, удзельнікамі баявых дзеянняў у Вялікую Айчынную і Карэйскую войны. Але найбольш каштоўнымі ён лічыць сведчанні пра штодзённыя падзеі 1930-х, 1950-х і нават 1980-х гг. На самай справе нават такія, здавалася б, блізкія да нас па часе перыяды былі моцна адрозныя ад таго свету, у якім жывём мы.

Як жартаўліва адзначае герой, ён ужо збіўся з ліку, спрабуючы ўспомніць, колькі разоў яго бачанне сваёй будучыні карэкціравалася і трансфармавалася. Цяпер малады гісторык надта далёка не зазірае. Але блізкую перспектыву звязвае з паступленнем у магістратуру і аспірантуру. Пакуль Марат бачыць у сабе сілы, матывацыю і цікавасць да вучобы, ён хоча выкарыстаць іх максімальна.

*– Многімі з радасных і светлых дзён студэнцтва я абавязаны майму навуковаму кіраўніку Андрэю Уладзіміравічу Любаму. Гэта бліскучы спецыяліст па сярэднявечнай гісторыі Беларусі, але, акрамя таго, яшчэ і вельмі добры чалавек. Менавіта такім павінен быць выкладчык. Андрэй Уладзіміравіч пасяліў ува мне веру, што мае намаганні, прыкладзеныя да самых розных навуковых праектаў і задумак, выдатkаваныя не дарма. Ён даў мне адчуванне поўнай свабоды і адначасова датычнасці да навуковага свету, пачуццё важнасці кожнага зробленага мной кроку,* – дадае студэнт.

На звычайнае для гісторыкаў пытанне наконт падарожжаў у часе Марат адказвае вельмі ўдумліва. Насуперак чаканням ён не хоча стаць сведкам вялікіх і славутых гістарычных падзей, знакамітых бітваў і эпахальных здзяйсненняў. Калі б з'явілася такая магчымасць, малады чалавек выбраў бы нашмат менш прыкметныя куткі нашага гістарычнага мінулага.

*– Я б з задавальненнем прайшоўся па месцах, знаёмых мне з дзяцінства, паназіраў бы за паўсядзённым жыццём сваіх продкаў, пастаяў бы на літургіі ў сельскіх драўляных храмах на прасторах Вялікага Княства Літоўскага,* – адзначае хлопец.

Асаблівa цікавым у вывучэнні мінулага для чацвёртакурсніка з'яўляецца ўсё, што звязана з «суб'ектыўным» фактарам у гісторыі: мысленне, рэлігійнасць і забабоны, а таксама побыт ва ўсіх яго праявах. Хлопца цягне туды, дзе ёсць шанец сутыкнуцца з таямнічым і непазнаным светам. Як прызнаецца Марат, ён быў здзіўлены, калі даведаўся, што цікавасць да такога дасягнення гісторыкаў XX ст., як абгрунтаванне неабходнасці вывучэння «маленькай» гісторыі, падзяляюць далёка не ўсе. Зрэшты, у тым і ёсць каштоўнасць свету гістарычных даследаванняў, што кожны можа знайсці ў ім свой «куток».

Стрыжнёвай якасцю гісторыка, на думку Марата Крупко, павінна быць уменне «разгаварыць» гістарычную крыніцу. Бачыць за тэкстам, часта загнаным у жорсткія фармальныя рамкі, чалавека з яго ментальнымі стэрэатыпамі, асаблівасцямі мыслення, страхамі і перавагамі. Маецца на ўвазе чытанне не толькі таго, што напісана, але і таго, што напісана не было. Валоданне падобным талентам можна лічыць найвялікшай каштоўнасцю. Прымусіць «гаварыць» можна не толькі пісьмовую крыніцу. Усё, да чаго дакранаўся чалавек, можа быць сведчаннем пра мінулае. І тое, колькі нам удасца ўзяць са старажытнай граматы або жменькі аскепкаў керамікі, залежыць не толькі ад характару крыніцы, але і ад таго, наколькі гісторык авалодаў сваім рамяством.

Апошнім часам малады чалавек праводзіць нямала часу за чытаннем. Галоўнае месца ў хатняй бібліятэцы, вядома, належыць кнігам па гісторыі, аднак ёсць цікавыя выданні па філасофіі, тэалогіі і псіхалогіі. Пашырыўся і спіс мастацкіх твораў, якія нарэшце пачаў для сябе адкрываць студэнт. На фоне бясконцай мітусні і шквалу вучэбных задач, юнак усё часцей адчувае патрэбу ў тым, каб пасядзець у цішыні з добрай кнігай і сам-насам са сваімі думкамі.

*– Асабіста мне блізкая думка, што чалавек павінен не шкадаваць сіл на тое, каб, памыляючыся і сумняваючыся, усё ж такі знайсці ў гэтым свеце нешта, што захапляе яго цалкам. І трэба толькі паступова рухацца ў выбраны бок,* – падводзіць вынік адораны студэнт.

Гісторыя – гэта не толькі падручнікі і даты. Гэта мільёны лёсаў, забытых галасоў, паўсядзённых клопатаў і маленькіх перамог. Марат Крупко нагадвае: каб зразумець мінулае, трэба не проста ведаць яго – трэба адчуць. І, магчыма, менавіта такія даследчыкі, як ён, робяць гісторыю сапраўды жывой.

**Марыя КАРКВЕЛІС**

# МОСТ ПАМІЖ КУЛЬТУРАМІ: ЯК У БДУ ВУЧАЦЦА І ЗНАХОДЗЯЦЬ СЯБЕ СТУДЭНТЫ З-ЗА МЯЖЫ

**Што аб'ядноўвае студэнта-міжнародніка з Манголіі, будучую журналістку з Расіі і юрыстку з Турцыі? Усе яны свядома абралі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і цяпер дзеляцца сваім унікальным досведам – ад першых цяжкасцяў адаптацыі да грандыёзных планаў па ўмацаванні міждзяржаўных адносін.**



Расіянка **Лізавета Мірошына** асвойвае прафесію мары на факультэце журналістыкі БДУ. Як распавядае другакурсніца, выбар на карысць беларускага ўніверсітэта быў старанна прадуманым: яна даўно разглядала спецыяльнасць журналіста, а БДУ быў найбольш прывабным варыянтам для атрымання якаснай адукацыі ў гэтай сферы.

Па словах Лізаветы, першыя ўражанні ад вучобы былі станоўчымі. Адукацыйны працэс, як адзначае студэнтка, у цэлым практычна нічым не адрозніваецца ад расійскага, за выключэннем некаторых спецыфічных дысцыплін, звязаных з нацыянальна-культурнымі асаблівасцямі. Таму ніякага акадэмічнага шоку або здзіўлення ад навучання дзяўчына не адчула.

Лізавета прызнаецца, што ходзіць на пары са шчырай радасцю. Да гэтага схіляе ўнікальная атмасфера, якая пануе на факультэце.

– *Вялізную ролю ў паспяховай сацыялізацыі адыгрываюць студэнцкія арганізацыі, якія рэгулярна ладзяць мерапрыемствы і дапамагаюць зблізіцца навабранцам са старэйшымі курсамі,* – падкрэслівае студэнтка.

Выкладчыкі, па яе словах, падаюць матэрыял максімальна займальна і даступна, што робіць навучальны працэс камфортным і сапраўды цікавым.

Адаптацыя, хоць і прайшла ў цэлым гладка, на першым этапе суправаджалася пэўнымі цяжкасцямі.

– *Вядома, першы час мала з кім мела зносіны, таму што аднагрупнікі пазнаёміліся на ўступных выпрабаваннях, а мяне ніхто там не бачыў і не ведаў,* – шчыра дзеліцца Лізавета.

Галоўнай праблемай, па прызнанні дзяўчыны, стаў моўны бар'ер: многія выкладчыкі размаўляюць па-беларуску, ды і некаторыя акадэмічныя дысцыпліны прадугледжваюць паглыбленае вывучэнне мовы. Аднак, з падзякай адзначае другакурсніца, адміністрацыя і выкладчыцкі склад ішлі насустрач і рабілі разумныя паслабленні, дапамагаючы адаптавацца да новага моўнага асяроддзя.

Звяртаючыся да будучых абітурыентаў-замежнікаў, Лізавета настойліва раіць запасціся цярпеннем і вытрымкай.

– *Чэргі, талоны, подпісы і збор дакументаў вельмі вымотваюць, але ў канчатковым выніку ўсе намаганні будуць не дарма,* – дадае яна з упэўненасцю.

Пакуль другакурсніца не будуе доўгатэрміновых планаў, засярodзіўшыся на блізкіх мэтах – стажыроўках на некалькіх тэлеканалах. Аднак за год жыцця ў Беларусі яна так шчыра палюбіла краіну, яе культуру і менталітэт, што сур'ёзна разглядае магчымасць застацца тут пасля заканчэння вучобы.



Студэнт факультэта міжнародных адносін **Уўганбаяр Эрдэмсайхан** прыехаў у Беларусь з Манголіі, каб атрымаць якасную еўрапейскую адукацыю. Будучае месца вучобы выбіраў доўга і скрупулёзна. Магчымымі варыянтамі былі прэстыжныя МДУ, МДІМА, СПбДУ, Томскі дзяржаўны ўніверсітэт і БДУ. Канчатковы выбар быў зроблены на карысць беларускага ўніверсітэта з некалькіх прычын: геаграфічная блізкасць да Еўропы, прывабны памер стыпендыі, а таксама шчырае жаданне паспрабаваць нешта прынцыпова новае, наведаць невядомую раней краіну і акунуцца ў іншае культурнае асяроддзе.

Вучоба на факультэце міжнародных адносін, з яго слоў, з самага пачатку давалася нялёгка. Малады чалавек шчыра прызнаецца, што сутыкнуўся з сур'ёзнымі цяжкасцямі пры адаптацыі да незвыклай універсітэцкай сістэмы.

– *У мяне наогул не было ніякіх уяўленняў пра ўніверсітэт. Падзел праграмы на лекцыі, семінары стаў для мяне навінкай,* – дзеліцца ён успамінамі пра першыя тыдні вучобы.

Найбольшую складанасць для яго ўяўляе каласальны аб'ём інфармацыі, які неабходна засвойваць штодня. Асаблівым выпрабаваннем становіцца экзаменацыйная сесія, якую ён характарызуе каротка і ёмка: «Перыяды, калі проста не спіш».

Вольнага часу ў актыўнага студэнта практычна няма. Акрамя інтэнсіўнай вучобы, ён сур'ёзна займаецца вакалам, служыць у тэатры і працуе прафесійным педагогам па танцах. Яго парада будучым першакурснікам-замежнікам – заўсёды заставацца адкрытым для новага досведу, быць гатовым да ўсяго, таму што вучоба ва ўніверсітэце ўяўляе сабой абсалютна новы этап, не падобны ні да чаго іншага ў жыцці, і многае, асабліва на першым курсе, можа сапраўды шакіраваць.

Што тычыцца планаў пасля заканчэння БДУ, студэнт упэўнена заяўляе пра намер працягнуць адукацыю ў Паўднёвай Карэі, каб пашырыць свае прафесійныя гарызонты. Заставацца ў Беларусі ён пакуль не плануе, але і не выключае такую магчымасць цалкам, пакідаючы прастору для волі лёсу.

– *А магчыма, я знайду сваё каханне тут, у Беларусі, і застануся назаўсёды. Вось праўда, жыццё непрадказальнае, і здарыцца можа ўсё,* – з іроніяй і цяплом падводзіць вынік малады чалавек.

Студэнтка з Турцыі **Ягры Бахар** вучыцца на чацвёртым курсе юрыдычнага факультэта. Як адзначае студэнтка, выбар на карысць Беларусі быў свядомым і ўзважаным крокам. Маючы ў скарбонцы дыплом Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. І. Чайкоўскага і мноства сяброў у Расіі, яна наслухалася пра высокі ўзровень мясцовай сістэмы адукацыі. Рашэнне атрымаць другую, юрыдычную, прафесію менавіта тут яна апісвае проста і лаканічна: «А чаму б і не?»



Па словах Ягры, першае, што кінулася ёй у вочы па прыездзе, – гэта дзіўная прырода і экалогія. Яна апісвае Беларусь як вельмі зялёную і жывую краіну, дзе гарманічна спалучаюцца сучасная ўрбаністыка і некранутыя прыродныя ландшафты. Адаптацыя, дзеліцца ўражаннямі студэнтка, прайшла дастаткова лёгка дзякуючы знаёмству са славянскім менталітэтам і культурнымі асаблівасцямі. З прыкметных адрозненняў яна вылучае толькі нязвыкла халоднае надвор'е і больш спакойны, больш размераны, чым у яе на радзіме, рытм жыцця мясцовых жыхароў.

Таварыская і дысцыплінаваная асоба, Ягры высока ацаніла ўнікальную атмасферу ва ўніверсітэце.

– *БДУ дае мноства магчымасцяў для нэтворкінгу, прафесійнага росту і знаёмстваў. Тут пануе асаблівая адзінства, я хутка абзавялася сябрамі з розных краін. Па-мойму, гэта проста здорава, што гэтае адзінства можа адчуць кожны»,* – дадае студэнтка.

Кажучы пра будучыню, дзяўчына раскрывае амбіцыйныя планы. Яе галоўная мэта – выкарыстаць атрыманую адукацыю для ўмацавання эканамічных і прававых адносін паміж трыма краінамі: Расіяй, Беларуссю і Турцыяй, ствараючы трывалыя масты супрацоўніцтва.

– *У Беларусі і ў БДУ вы не адчуеце сябе чужымі дзякуючы неверагоднай гасціннасці і шчырасці мясцовых жыхароў, а таксама зможаце атрымаць сапраўды якасную еўрапейскую адукацыю,* – звярнулася чацвёртакурсніца да замежных абітурыентаў.

На думку студэнткі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт працягвае заставацца прывабным адукацыйным цэнтрам для моладзі з розных куткоў свету, прапануючы не толькі высокія акадэмічныя стандарты, але і камфортную, сяброўскую атмасферу для асабістага і прафесійнага росту.

Досвед гэтых студэнтаў – найлепшы адказ на сумненні тых, хто толькі задумваецца пра вучобу за мяжой. Так, адаптацыя патрабуе намаганняў, а працэс паступлення – цярплівасці, але вынік таго варты. Якасная адукацыя, міжнародная супольнасць і перспектывы для кар'ернага росту становяцца рэальнасцю для тых, хто, як героі гэтага матэрыялу, адважваецца на сур'ёзны крок.

**Марыя КАРКВЕЛІС**

# СТРАТЭГІЧНЫЯ МЭТЫ БДУ НА НАСТУПНУЮ ПЯЦІГОДКУ

## МЭТА №1

## ПАВЫШЭННЕ ЯКАСЦІ І КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ АДУКАЦЫІ Ў АДПАВЕДНАСЦІ З НАЦЫЯНАЛЬНЫМІ ПРЫЯРЫТЭТАМІ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ І ІНАВАЦЫЯМІ Ў НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ СФЕРЫ

### Задачы ў рамках мэты на 2025/2026 год:



- Забеспячэнне ўзаемнай каардынацыі патрабаванняў рынку працы і зместу адукацыі праз адкрыццё новых запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў (не менш за 5)
- Павелічэнне долі навучэнцаў, залучаных у сістэму працы з адоранымі і высокаматываванымі студэнтамі
- Развіццё лічбавага адукацыйнага асяроддзя, распрацоўка Палітыкі па выкарыстанні тэхналогій і інструментаў штучнага інтэлекту ва ўніверсітэце
- Прырост колькасці дамоў з арганізацыямі-заказчыкамі кадраў, якія рэалізуюць сістэму «Заказ – практыка – працаўладкаванне»

## МЭТА №2

## РАЗВІЦЦЁ НАВУКОВАЙ І ІНАВАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ШЛЯХАМ ПАГЛЫБЛЕННЯ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ З РЭАЛЬНЫМ СЕКТАРАМ ЭКАНОМІКІ І ПАВЫШЭННЯ ДОЛІ МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

### Задачы ў рамках мэты на 2025/2026 год:



- Павелічэнне долі пазабюджэтнага фінансавання навуковых даследаванняў і распрацовак шляхам рэалізацыі дамоў з арганізацыямі і прадпрыемствамі Рэспублікі Беларусь
- Стварэнне сумесных навукова-даследчых структур і рэалізацыя кантрактаў з арганізацыямі і прадпрыемствамі Расійскай Федэрацыі і Кітайскай Народнай Рэспублікі з мэтай павелічэння экспарту навукаёмістых тавараў і паслуг у галіне навукі
- Павышэнне даступнасці і сеткавай бачнасці публікацый шляхам рэалізацыі праекта па загрузцы артыкулаў адкрытага доступу аўтараў БДУ з часопісаў, якія індэксуюцца ў навукаметрычнай базе даных Scopus
- Нарошчванне экспарту адукацыйных паслуг за кошт павелічэння кантынгенту замежных аспірантаў БДУ

## МЭТА №3

## СТВАРЭННЕ СПРЫЯЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ ДЛЯ ПРАФЕСІЙНАЙ САМАРЭАЛІЗАЦЫІ І ДОЎГАТЭРМІНОВАЙ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦІ СУПРАЦОЎНІКАЎ, ПАВЫШЭННЕ ПРЭСТЫЖУ ЎНІВЕРСІТЭТА НА РЫНКУ ПРАЦЫ

### Задачы ў рамках мэты на 2025/2026 год:



- Амаладжэнне працоўнага калектыву: прыцягненне маладых спецыялістаў, захаванне сярэдняга ўзросту прафесарска-выкладчыцкага складу
- Скарачэнне колькасці вакантных ставак па ўсіх катэгорыях персаналу, зніжэнне каэфіцыента цякучасці кадраў
- Павелічэнне долі прафесарска-выкладчыцкага складу, што мае навуковыя ступені і званні, у падраздзяленнях, у якіх аступененасць складае ніжэй за 50%
- Развіццё прафесійных кампетэнцый работнікаў, рэалізацыя праграмы настаўніцтва
- Укараненне і мадэрнізацыя актуальных модуляў у ІС «Кіраванне персаналам»

## МЭТА №4

## ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ ІДЭАЛАГІЧНАЙ І ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ Ў АДПАВЕДНАСЦІ З АСНОВАМІ ІДЭАЛОГІІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

### Задачы ў рамках мэты на 2025/2026 год:



- Распрацаваць комплекс мер і крытэрыі іх эфектыўнасці па ажыццяўленні БДУ інфармацыйнай дзейнасці для стварэння спрыяльнага інфармацыйнага асяроддзя, якое адпавядае мэтам і задачам развіцця Рэспублікі Беларусь
- Працягнуць рэалізацыю ў БДУ распрацаванага комплексу мер і крытэрыяў іх эфектыўнасці па забеспячэнні захаванасці і прасоўванні традыцыйных каштоўнасцяў беларускага народа, узаемадзеянні з Беларускай праваслаўнай царквой у рамках Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой ад 12.06.2003
- Працягнуць рэалізацыю ў БДУ распрацаванага комплексу мер і крытэрыяў іх эфектыўнасці па ажыццяўленні прафілактычнай дзейнасці па напрамках

# І ЗАДАЧЫ НА 2025/2026 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

## МЭТА №5

## УМАЦАВАННЕ ПРЭСТЫЖУ ЎНІВЕРСІТЭТА ЯК НАДЗЕЙНАГА ПАРТНЁРА Ў МІЖНАРОДНАЙ ПРАСТОРЫ, ПАВЫШЭННЕ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ НА ГЛАБАЛЬНЫМ РЫНКУ АДУКАЦЫІ І НАВУКІ

### Задачы ў рамках мэты на 2025/2026 год:

- Умацаванне станоўчага іміджу БДУ за мяжой шляхам пашырэння геаграфіі традыцыйных партнёраў і выканання плана экспарту:
  - выкананне даведзенага задання па экспарце адукацыйных паслуг;
  - забеспячэнне не менш чым 20 міжуніверсітэцкіх дамоў з вядучымі замежнымі ВНУ і прыём не менш чым 30 дэлегацый
- Правядзенне аптымізацыі структуры набору замежных грамадзян:
  - павелічэнне колькасці замежных студэнтаў бакалаўрыята за кошт краін Цэнтральнай Азіі (Туркменістан), Блізкага Усходу (Іран, Ірак, Сірыя), Афрыкі, Індыі;
  - актывізацыя набору ў англамоўную магістратуру прыродазнаўчанавуковых спецыяльнасцяў
- Рэалізацыя комплексу мерапрыемстваў для забеспячэння дыверсіфікацыі ўдзелу ў міжнародных рэйтынгах і захавання пазіцый у існых



## МЭТА №6

## УМАЦАВАННЕ ЭКАНАМІЧНАГА І МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ

### Задачы ў рамках мэты на 2025/2026 год:

- Прыцягненне ўсіх крыніц фінансавання для забеспячэння фінансавых запатрабаванняў універсітэта
- Павышэнне даходаў універсітэта ад экспарту адукацыйных паслуг, дадатковых паслуг і навуковых распрацовак
- Забеспячэнне ўстойлівага росту сярэдняй заработнай платы ўсіх катэгорый работнікаў, сінхранізацыя вынікаў працы і росту заработнай платы
- Увод у эксплуатацыю лабараторыі структурнай і функцыянальнай біялогіі бялку
- Будаўніцтва лабараторнага корпуса біялагічнага факультэта (тэрмін заканчэння – 2027 год)
- Працяг капітальнага рамонту III – IV чэргаў галоўнага корпуса (пры вылучэнні фінансавых сродкаў з рэспубліканскага бюджэту)




## МЭТА №7

## ФАРМІРАВАННЕ СТАТУСА ЎНІВЕРСІТЭТА ЯК ВЯДУЧАГА ЦЭНТРА АДУКАЦЫІ, ДАСЛЕДАВАННЯЎ І ІНАВАЦЫЙ У ГАЛІНЕ КІБЕРБЯСПЕКІ

### Задачы ў рамках мэты на 2025/2026 год:

- Развіццё адукацыйных праграм і адкрыццё палігонаў для практычнай падрыхтоўкі
- Распрацоўка актуальных рашэнняў для забеспячэння кібербяспекі і падтрымка сістэмы абароны інфармацыі



УНІВЕРСІТЭТ
23 верасня 2025 года, №9 (2300)

# ВЫСТАВА «ПРА ЖЫЦЦЁ, ВУЧОБУ І СЛУЖЭННЕ» ПРАЙШЛА Ў БДУ

**25 жніўня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце адкрылася выстава «Пра жыццё, вучобу і служэнне», прысвечаная пяцігоддзю прызначэння Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Ва ўрачыстым мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы, студэнты, выкладчыкі і адміністрацыя БДУ.**




## ШЛЯХ ДА ДАБРА І МІРУ

Вітаючы гасцей знакавага мерапрыемства, першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта **Дзмітрый Курловіч** падкрэсліў важнасць гэтай даты і ролю моладзі ў захаванні і развіцці культурных традыцый. Ён адзначыў, што ў сучасным свеце, дзе тэхналогіі і інавацыі актыўна ўплываюць на жыццё грамадства, патрэбна не забываць пра духоўныя арыенціры і гуманістычныя ідэалы.



*– Сёння ў высокатэхналагічным свеце неабходна актыўна развіваць традыцыйныя каштоўнасці і духоўнае выхаванне, каб прадухіліць культурны раскол і паказаць студэнтам неабходнасць гуманістычных прынцыпаў. Вялікія асобы, сярод якіх і мітрапаліт Веніямін, сваім жыццёвым прыкладам паказваюць значэнне веры і сапраўдны шлях да дабра і міру,* – адзначыў першы прарэктар.

Выпускнікі БДУ займаюць вядучыя пазіцыі ў навуковай, адукацыйнай і грамадскай сферах Беларусі. Сярод іх – акадэмікі, дактары навук, прафесары, дырэктары навуковых устаноў, паспяховыя прадпрымальнікі і дзяржаўныя дзеячы. Аднак не менш важная роля тых выпускнікоў, якія прысвяцілі сваё жыццё духоўнаму служэнню і развіццю праваслаўнай супольнасці.

З ліку такіх выпускнікоў вылучаецца мітрапаліт – чалавек, які змог злучыць глыбокія прафесійныя веды з духоўным прызваннем. Яго прыклад дэманструе, што адукацыя ў БДУ не абмяжоўваецца перадачай акадэмічных ведаў, але і фарміруе маральныя арыенціры, важныя для сацыяльнай адказнасці і служэння грамадству.

Пра студэнцкія гады і паўсядзённае жыццё мітрапаліта Веніяміна расказаў першы прарэктар ДУА «Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла» БДУ **Сергій Маўсесян**. Ён таксама звярнуў увагу, што ўладыка актыўна ўдзельнічае ў духоўным жыцці краіны, рэгулярна наведваючы розныя куткі Беларусі, прысутнічае на малітвах і літургіях, дзе сустракаецца з прыхаджанамі, і падтрымлівае царкоўныя традыцыі.

*– Спадзяюся, што матэрыялы, прадстаўленыя на выставе, дапамогуць адкрыць новыя грані асобы святарскага служыцеля і царквы,* – падкрэсліў першы прарэктар, адзначыўшы важнасць падобных мерапрыемстваў для лепшага разумення значнасці служэння мітрапаліта Веніяміна.

У экспазіцыю выставы ўвайшлі архіўныя фотаздымкі студэнцкіх гадоў мітрапаліта, а таксама кадры, якія адлюстроўваюць яго жыццё і прафесійную дзейнасць. Стэнды былі дапоўнены багаслоўскай літаратурай і царкоўным адзеннем, што дазволіла глыбей пагрузіцца ў свет духоўнага служэння.

Арганізатарамі выставы сталі ўпраўленне па справах культуры і музей гісторыі БДУ, а таксама сінадальны інфармацыйны аддзел Беларускай праваслаўнай царквы. Гэта супрацоўніцтва дазволіла стварыць унікальны праект, які аб'ядноўвае гістарычную каштоўнасць і духоўную спадчыну.



## БІЯГРАФІЯ

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усёй Беларусі, з'яўляецца выпускніком факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ 1992 года. Пасля ён працягнуў духоўную адукацыю, скончыўшы Мінскую духоўную семінарыю ў 1996 г. і Мінскую духоўную акадэмію ў 1999 г. У тым жа годзе яму быў нададзены сан ігумена, а ў 2006 г. – архімандрыта.

З 2010 па 2015 год мітрапаліт Веніямін займаў пасаду старшыні выдавецкага савета Беларускай праваслаўнай царквы. З 2014 года ўзначальваў Сінадальны аддзел рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі Беларускага экзархату, а з 2014 па 2020 год быў Праасвяшчэнным Барысаўскім і Мар'інагорскім.

Рашэннем Свяшчэннага Сінода ад 25 жніўня 2020 года ён быў прызначаны Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, Мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім, з захаваннем часовага кіравання Барысаўскай епархіяй. 6 верасня 2020 года мітрапаліту Веніяміну быў нададзены сан мітрапаліта Найсвяцейшым Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам за Боскай літургіяй у кафедральным саборным Храме Хрыста Збаўцы ў Маскве.

З 2020 года мітрапаліт Веніямін таксама з'яўляецца рэктарам Інстытута тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірыла БДУ, працягваючы традыцыі духоўнага і адукацыйнага служэння.

Ён быў адзначаны мноствам царкоўных і дзяржаўных узнагарод, уключаючы ордэн св. Кірыла Тураўскага II ступені (2009), Крыж прп. Еўфрасінні Полацкай (2013), ордэн прп. Серафіма Сароўскага III ступені (2018), II ступені (2023) і I ступені (2025). Таксама ён удастоены прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2015) і Пашаны Міністэрства культуры Беларусі (2024).

**Таццяна САВІЦКАЯ**

# СЕМ'І Ў БДУ: ГІСТОРЫІ КАХАННЯ

**Каханне і сям'я не заўсёды прыходзяць калі заплануеш. Гэтыя дзве гісторыі – пра пары, якія па-рознаму, але шчыра і аддана будуюць сваё шчасце. Абодва шляхі сведчаць: калі ў аснове – давер, падтрымка і сумесныя імкненні, саюз становіцца непаўторным і трывалым.**



## СЯМ'Я ТСІАГКОС: ГАННА І НІКАС

Гісторыя гэтай сям'і пачалася з першага курса ўніверсітэта. Абодва студэнты, з рознымі інтарэсамі і характарамі, але іх аб'яднала імкненне да ведаў, прафесійнага росту і, як выявілася пазней, да пабудовы моцнай сям'і. Менавіта ўніверсітэт стаў для **Ганны** і **Нікаса** не толькі месцам вучобы, але і адпраўным пунктам у новай главе жыцця.

Рашэнне стварыць сям'ю не спантаннае – яно было сталым, асэнсаваным і неверагодна цёплым. Як адзначае пара, яны адчулі, што хочацца побач адно з адным прачынацца кожную раніцу, вучыцца, марыць пра будучыню, калі цяжка, і смяяцца, калі добра, планаваць будучыню. Гэта шанец не проста пражыць маладосць, а зрабіць яе ўсвядомленай і трывалай асновай для жыцця. Ісці па жыцці разам заўсёды прасцей, чым паасобку.

*– Мы ўжо пачалі ствараць свае маленькія, але дарагія сэрцу традыцыі. Напрыклад, кожную суботу раніцай мы гатуем разам снеданак – гэта час, калі можна павольна пагаварыць, пасмяяцца, падзяліцца думкамі і планамі. На святы мы абавязкова збіраем самых блізкіх за адным сталом, бо падтрыманне сувязі са сваякамі – важная частка нашых каштоўнасцяў. Акрамя таго, мы любім падарожнічаць – нават невялікія паездкі дораць нам новыя ўражанні і ўмацоўваюць наш саюз.*

Сям'я для Нікаса і Ганны – гэта не рамкі, не абавязкі, а дом у самым глыбокім сэнсе гэтага слова. Гэта месца, дзе цябе разумеюць, нават калі ты маўчыш. Дзе цябе абдымаюць, калі ўвесь свет быццам адвярнуўся.

Маладым сем'ям важна ўзаконіць свае адносіны шлюбам, таму што гэта аснова прававой і псіхалагічнай стабільнасці. Зарэгістраваны шлюб дае абодвум партнёрам юрыдычныя гарантыі: магчымасць распараджацца сумеснай маёмасцю, права на спадчыну, прыняцце рашэнняў у экстранных сітуацыях, доступ да дзяржаўных ільгот і праграм падтрымкі. Афіцыйны статус узмацняе ўнутраную ўпэўненасць партнёраў адно ў адным.

*– Мы верым, што сапраўдная сям'я пачынаецца там, дзе ёсць каханне, павага, агульныя мары і жаданне быць побач. І мы шчаслівыя, што знайшлі гэта. Мы хочам быць прыкладам для іншых маладых людзей: паказваць, што любоў і партнёрства, заснаваныя на ўзаемапавазе, здольныя пераадолець любыя цяжкасці. Пакуль многія баяцца адказнасці, вы можаце стаць прыкладам усвядомленага дарослага жыцця: не з прычыны страху, а з кахання, павагі і жадання расці разам.*

## СЯМ'Я ЛАЗІНСКІХ: ІВАН І ІРЫНА

*– Не ў час, не паводле плана, але па-сапраўднаму. Я проста хацела пажыць для сябе. Калі б пару гадоў таму вы спыталі мяне, ці хачу я сям'ю, я засмяялася б. Ніякіх белых сукенак, пярсцёнкаў, сямейных партрэтаў. У галаве былі дэдлайны, вучоба, дыплом, стажыроўка і звыклае: «Ну пажыву для сябе гадоў да трыццаці»,* – адзначае **Ірына**.

Маладыя людзі пазнаёміліся на працы. Ён быў начальнікам, і ўсё пачалося з абедаў, гутарак, рэдкіх прагулак. Ірына злавіла сябе на думцы, што ёй проста добра побач з ім. Так і працягвалася: суседнія сталы, агульныя праекты, шмат часу разам – і чамусьці гэта не стамляла, а радавала.

Праз некалькі месяцаў дзяўчына раптам зразумела: з гэтым чалавекам яна хоча ісці далей па жыцці. Пару разоў наша гераіня намякнула на вяселле, а ён… проста зрабіў прапанову.

*– Ну, прыйшлося згаджацца,* – жартуе Ірына.

А потым – чорны лебедзь. За пару месяцаў да вяселля ў Івана выявілі рак. Абследаванні, урачы, нявызначанасць, аперацыя. Ён быў моцным, а яна – старалася. Але дзесьці на гэтым шляху ў нявесты здарыўся нервовы зрыў. Усё валілася з рук. Хацелася выключыцца, збегчы. Яна амаль не хацела вяселля. Амаль.

*– Але ён абдымаў мяне – і ў гэтыя моманты ўсё ўнутры збіралася назад. Потым ламалася зноў, калі я адна ехала ноччу з яго бальнічнай палаты ў пустую кватэру. І ўсё ж мы распісаліся. Ён толькі выйшаў з бальніцы, ледзь стаяў на нагах, забыў пашпарт. Вясельны танец, напэўна,*



*быў такім недарэчным. Але гэта быў адзін з самых цёплых дзён у маім жыцці, бо мы заявілі сабе і нашым блізкім, што будзем разам.*

Пасля вяселля – хіміятэрапія. Маладой сям'і сказалі, што дзяцей хутчэй за ўсё не будзе. Гэта як быццам падвесіла ўсё, замарозіла ўнутры. Але яны былі побач. Без гераізму. Проста таму што інакш – не ўяўлялі. Калі хвароба адступіла задумаліся пра набыццё кватэры. Махляры, зрывы здзелак, замарожаныя рахункі ў банку па падазрэнні ў махлярстве. У нейкі момант Ірына ўжо не адчувала нічога – проста жыла дзень за днём.

А потым Новы год. Станоўчы тэст на цяжарнасць. Муж узрадаваўся – жонка не адразу. У галаве была паніка, страх, непрыманне. Яна планавала зусім іншы сцэнарый. Але крок за крокам, і ёй удалося прыняць тое, што здарылася. І знайсці станоўчыя аргументы.

Цяпер усё гэтак жа: суседнія сталы, агульныя паездкі, рэдкія спрэчкі, шмат смеху.

*– Часам лаўлю сябе на думцы: вось гэта – тое, чаго я раней дакладна не хацела. Але цяпер не аддала б ні за што. Калі б я трапіла ў мінулае, то ўсё роўна выбрала б той самы шлях. Хоць і не ў час, і не паводле плана. Але па-сапраўднаму.*

Гісторыя сям'і Лазінскіх – яшчэ і напамін для тых, хто толькі пачынае свой жыццёвы шлях разам: не бойцеся давяраць адно аднаму, падтрымлівайце і шанаваць нават самыя звычайныя моманты. Кахайце шчыра і смела, разам пераадольвайце цяжкасці, як каманда. Памятайце, што сапраўднае багацце сям'і ў адзінстве сэрцаў і ўзаемным клопаце. Хай побач з вамі заўсёды будзе чалавек, з якім хочацца падзяліцца і працоўны стол, і гульню, і ўсе дарогі жыцця!

## НАВІНЫ МІНСКА І БЕЛАРУСІ

Нацыянальны банк Беларусі выпусціць дзве памятныя манеты ў стылі дзіцячага фальклору і народных казак. Манета «Загадкі» належыць да серыі «Беларускі дзіцячы фальклор» і мае наміналы 20 рублёў (серабро) і 1 рубель (медна-нікелевы сплаў). Манета «Былінка і верабей» выйдзе ў серыі «Беларускія народныя казкі», таксама наміналамі 20 і 1 рубель. Дызайн манет адлюстроўвае сюжэты загадкі пра зорнае неба і казкі пра былінку і вераб'я, змяшчае выявы персанажаў і сімвалаў. Нягледзячы на адрозненне ад звычайных грошай, гэтымі манетамі можна расплачвацца ў Беларусі па намінале.

У Цэнтральным раёне Мінска прадставілі праекты для «Мінскай змены – 2025», якія ахопліваюць культуру, тэхналогіі, здаровы лад жыцця і падтрымку моладзі. Сярод ініцыятыў вылучаецца «Арт-білет» – субсідыя для моладзі на наведванне культурных мерапрыемстваў, і мадэрнізацыя галерэі «Палац» у пляцоўку для творчай супольнасці. Таксама прапанаваны лічбавая платформа для глабальнага гандлю, валанцёрскі рух па навучанні людзей пажылога ўзросту карыстанню смартфонамі і фестываль здароўя з магчымасцю вымярэння паказчыкаў да і пасля ўдзелу. Мэта праектаў – не толькі развесяліць, але і стварыць доўгатэрміновыя станоўчыя змены ў грамадстве.

У Беларусі ў 2025 годзе плануецца знесці 185 старых і невыкарыстоўваных жылых дамоў, што значна перавышае тэмпы мінулых гадоў. Працы праводзяцца ў рамках Указа №116 для паляпшэння стану тэрыторый, палова плана на год ужо выканана. Усяго ў дзяржаўным жылым фондзе налічваецца каля 5 тысяч такіх памяшканняў, уключаючы аднакватэрныя дамы. Да 2030 года плануецца максімальна знесці незапатрабаваны жылы фонд, для чаго прадугледжаны механізмы продажу, у тым ліку за адну базавую велічыню.

Мінскія медыкі занялі першае месца сярод замежных каманд на спаборніцтвах брыгад хуткай дапамогі ў Актаў (Казахстан). Беларуская каманда, якая прадстаўляла Гарадскую станцыю хуткай медыцынскай дапамогі Мінска, абышла супернікаў з Масквы і Баку. У склад дэлегацыі ўвайшлі ўрач Кацярына Бандарэнка, фельчар Дыяна Лазар і галоўны ўрач Аляксандр Жынько. Рэспубліканскі чэмпіянат, які праходзіў з 17 па 19 верасня, сабраў два дзясяткі каманд з Казахстана, Азербайджана, Беларусі і Расіі.

У Мінску з 2016 года праводзяцца вымярэнні забруджвання паветра ў рамках Тыдня мабільнасці, якія паказваюць зніжэнне ўзроўню шкодных рэчываў у 1,2-1,3 разы. Аўтатранспарт застаецца асноўнай крыніцай забруджвання (каля 80%) з пікавымі канцэнтрацыямі аксідаў азоту і вуглявроду ў гадзіны пік. Пераход на электрамабілі і адкрыццё новых станцый метрапалітэна спрыяюць зніжэнню нагрузкі ад транспарту. Па статыстыцы, нягледзячы на ваганні, агульныя выкіды ад мабільных крыніц у Мінску дэманструюць тэндэнцыю да зніжэння.

У фінале міжнароднага музычнага конкурсу «Інтэрбачанне» 20 верасня перамог выканаўца з В'етнама Дык Фук, набраўшы 422 балы. Беларуска Анастасія Краўчанка з песняй «Матылёк» заняла шостае месца з 341 балам, атрымаўшы высокія адзнакі ад журы з некалькіх краін. У конкурсе прынялі ўдзел прадстаўнікі 22 краін, уключаючы Беларусь, Расію і іншыя краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Наступны конкурс «Інтэрбачанне» адбудзецца ў 2026 годзе ў Саудаўскай Аравіі.

УНІВЕРСІТЭТ
23 верасня 2025 года, №9 (2300)

# САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ У БДУ



**Як гэта – заходзіць у будынак дзе ты нікога не ведаеш, дзе ніхто не ведае цябе, а галоўнае, дзе цябе ніхто не чакае? Першакурснікі БДУ адказаць на такое пытанне не змогуць, таму што з першых дзён іх сустракаюць на факультэтах і «вядуць за руку» ў студэнцкае жыццё. Лекцыі, знаёмствы, тымбілдынгі, кірмашы чакаюць новых студэнтаў ужо ў першыя дні вучобы, а «Віват» становіцца не толькі яркай кропкай у знаёмстве з БДУ, але і пачаткам маштабных універсітэцкіх падзей**.

Сустрэча з групай, куратарамі і адміністрацыяй факультэта ў студэнтаў праходзіць яшчэ ў канцы жніўня. На журфаку збіраюцца ў актавай зале, на мехмаце – у аўдыторыях, але сутнасць адна: гэта афіцыйнае мерапрыемства, якое дае базавае разуменне таго, што адбываецца вакол. Прамова ад адміністрацыі, запаўненне дакументаў і выбары старасты, а далей ініцыятыву прымаюць студэнцкія арганізацыі. Студсавет, праектны і творчы напрамкі студсавета, прафкам, БРСМ, старастат, навуковыя і спартыўныя аб'яднанні прыцягваюць першакурснікаў і распавядаюць пра магчымасці праявіць сябе. Усё гэта дае зразумець: універсітэцкае жыццё значна шырэйшае, чым проста расклад заняткаў.

Факультэты надаюць сустрэчы першакурснікаў асаблівую ўвагу. Напрыклад, на факультэце міжнародных адносін над ёй працуюць усе арганізацыі. Як толькі з'яўляюцца спісы залічаных, куратары са студэнцкай куратарскай службы (СКС) пачынаюць знаёміцца з будучымі студэнтамі. Ужо да пачатку навучальнага года праходзяць тымбілдынгі. У пачатку верасня плынь мерапрыемстваў не спыняецца: унікальныя актыўнасці і прадстаўленне арганізацый на розных паверхах факультэта, якія першакурснікі праходзяць як квест, у вызначаным парадку; «Hello-першакурснік» ад праектнага напрамку студсавета ФМА, дзе студэнты ўдзельнічаюць у пікетах, слухаюць музыку, даведваюцца больш пра арганізацыю і частуюцца выпечкай ад актывістаў; на новым мерапрыемстве ФМА «Тыдзень спецыяльнасцяў» першакурснікі самі арганізоўваюць актыўнасці, пікеты і акцыі. Напрыклад, кафедра міжнароднага турызму рыхтуе жартоўныя візы і карту свету для абазначэння краін з віш-ліста, міжнародная лагістыка – машынкі на радыёкіраванні для праходжання паласы перашкод, усходазнаўцы гатуюць стравы традыцыйнай азіяцкай кухні.

**Ульяна**, студэнтка 4 курса ФМА, лічыць, што дзякуючы такім мерапрыемствам першакурснікі хутчэй становяцца часткай факультэта, зараджаюцца атмасферай і з энергіяй заглыбляюцца ў вучобу:

*– Наогул, у нас для першакурснікаў вельмі шмат мерапрыемстваў, яны ідуць беспераПынна. А «Тыдзень спецыяльнасцяў», з прычыны павелічэння колькасці спецыяльнасцяў, доўжыцца цэлых 10 дзён. Калі я была першакурсніцай, насычанае жыццё павялічвала маю цікавасць да факультэта, і я адчувала, што пра мяне клапоцяцца, таму цяпер я стараюся гэтак жа клапаціцца пра новых студэнтаў.*

**Аляксей**, актывіст філалагічнага факультэта, таксама лічыць сустрэчы важнымі для адаптацыі першакурснікаў. Хлопец адзначае і неабходнасць падобных сустрэч для арганізацый, бо гэта дапамагае прыцягваць новых асоб. Калі ён быў першакурснікам, на філфаку праводзілі «Кірмаш арганізацый», дзе ў асобных пунктах аб'яднанні распавядалі пра сябе і адказвалі на пытанні.

Падобны фармат праводзяць і на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі. «Кірмаш актыўнага студэнта» стаіць як асобная лекцыя ў раскладзе, але вядуць яе студэнты.

*– Нам на першым курсе такія лекцыі яшчэ не праводзілі, а самому па частках збіраць інфармацыю складана. Асабліва такія мерапрыемствы важныя для маленькіх арганізацый, каб заявіць пра сябе,* – адзначае Аляксандр, старшыня праектнага напрамку студсавета геафака. Неафіцыйная частка знаёмства на геафаку выглядае так: студэнты збіраюцца каля інтэрната, і кожны курс дзеліцца ўспамінамі або чаканнямі ад універсітэцкага жыцця.

Асаблівыя традыцыі таксама ёсць на механіка-матэматычным факультэце і факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Там, акрамя афіцыйнай часткі ў аўдыторыях, у першыя-другія выхадныя верасня першакурснікі і актывісты праектнага напрамку студсавета едуць у лес, каб праходзіць пікеты на сілу, спрыт і кемлівасць. Актыўнасць хутка зблізае, а свабодны фармат дае магчымасць адпачыць.

*– Я сама, калі была першакурсніцай, думала пра студэнтаў з арганізацый так: «Што вы мне тут расказваеце? Пусціце мяне адпачыць з маімі сябрамі». Але цяпер гляджу, наколькі ім адгукаецца тое, што мы гаворым і робім, сама адчуваю да іх цікавасць і нейкае чаканне іх актыўнасці,* – адзначае Дар'я, кіраўнік дызайну праектнага напрамку студсавета ФПМІ і куратар СКС.

Факультэт журналістыкі робіць стаўку на зносіны. Сёлета на журфаку ўпершыню правялі спід-фрэндынг – гэта мерапрыемства накіравана на знаёмства першакурснікаў з праектным напрамкам студсавета журфака і саміх студэнтаў адно з адным. Фармат хуткіх сустрэч прадугледжвае пастаянную змену кампаніі, што дазваляе пазнаёміць максімальную колькасць студэнтаў. У творчага напрамку асноўныя мерапрыемствы пачынаюцца раней, таму і першая сустрэча больш фундаментальная, з інфармацыйнай прэзентацыяй. А ўжо на другім тыдні вучобы напрамак праводзіць набор у каманду для ўдзелу ў агульнаўніверсітэцкім фестывалі першакурснікаў YFM.

Асноўная задача актывістаў не проста прыцягнуць новых людзей у арганізацыі, але, па словах **Лізаветы**, старшыні студсавета факультэта журналістыкі БДУ, запаліць агонь у вачах:

*– Калі я ўбачыла актывістаў на сваім першым курсе, я проста не магла паверыць, што ёсць такія студэнты, што яны наогул здольныя арганізоўваць такія мерапрыемствы, што ў іх ёсць столькі выдатных навыкаў, магчымасцяў. І таму мяне заўсёды гэта матывавала. Я разумела, што і сама хачу выйсці на іх узровень і працягваць рабіць так, як яны, а з кожным годам рабіць яшчэ лепш.*

Агульнаўніверсітэцкае мерапрыемства «Віват, студэнт БДУ» для першакурснікаў асабліва эмацыйнае. Гэта маштабная падзея аб'ядноўвае ўсе факультэты ў адной зале. «Віват» – гэта сапраўднае свята, дзе першакурснікі разумеюць маштаб універсітэта і адпачываюць у вялікай «сям'і». Ужо ў наступным годзе частка з іх апынецца на сцэне, але пакуль студэнты ўліваюцца ў асяроддзе і назіраюць за развіццём падзей анлайн і афлайн.

У сацыяльных сетках арганізацыі паказваюць сэнс і атмасферу сваіх мерапрыемстваў, у жывых размовах перадаюць энергію, а дзякуючы піяр-акцыям прыцягваюць яшчэ больш увагі першакурснікаў, каб паказаць, што студэнцкае жыццё – гэта не толькі пары, але і магчымасць раскрыць таленты. З досведу многіх актывістаў, каб студэнцкае жыццё прайшло максімальна актыўна і насычана, варта далучыцца да арганізацый і ўдзельнічаць у мерапрыемствах, а таксама іх праводзіць, таму што так вы ніколі не будзеце адчуваць сябе самотна. Студэнты развіваюць свае сілы, раскрываюць таленты, знаходзяць шмат новых сяброў, хутчэй адаптуюцца і робяць вельмі карысныя рэчы, якія дапамогуць ім у будучыні.

**Ксенія СМІРНОВА**

## Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| **Дацэнт** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў |
| **Старшы выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |
| **Выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, не менш за 1 год. |

**«ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ» БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД:**

Лабараторыя нанаэлектрамагнетызму
Старшы навуковы супрацоўнік – 1 чалавек.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220006, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 17 352 42 31.

**Факультэт журналістыкі аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю | 3 гады |
| Загадчык кафедры медыялогіі | 1 год |
| Дацэнт кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі | 2 гады |
| Дацэнт кафедры міжнароднай журналістыкі (2 стаўкі) | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання | бестэрмінова |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 301; да 22 кастрычніка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 323; да 21 лістапада.

**Кафедра фізічнага выхавання і спорту аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту | – |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 8а, УСК «Універсітэцкі», каб. 215;
да 22 кастрычніка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу;
г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 8а, УСК «Універсітэцкі», каб. 224;
да 21 лістапада.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 23.09.2025 г.
Зак. 824. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*